**ПАМОРАК**, дэманалагічная постаць павальнай смерці, што ахоплівае людзей і жывёлу. У нар. апавяданнях персаніфікаваўся ў заамарфных (ката, сабакі), так і антрапаморфных (старой бабы, худой, нібы смерць, жанчыны) вобразах; страшнага аднавокага дзеда з калматай барадою; жабрака; маладзіцы, у якой вуж смокча грудзі. Набыўшы чалавечае аблічча, П. усяляк імкнуўся пранікнуць у не заражаныя яшчэ паселішчы з дапамогаю іх жыхароў, дзеля чаго прасіў падвезці на возе, пераправіць цераз раку. Калі нейкі недарэка спрыяў гэтай просьбе, П. неўзабаве пачынаў лютаваць у чарговай мясцовасці. Калі ж кемлівы чалавек здагадваўся адразу, з кім ён мае справу, то падманным шляхам заводзіў П. ў балота, дзе тапіў яго або скідваў у вогнішча. Агонь, здабыты непасрэдна ад трэння, лічыўся эфектыўным сродкам ад П. На месцы яго здабычы і па канцах сяла з яго распальвалі вогнішчы, якія палілі дзень і ноч, каб П. не мог увайсці ў сяло. Той агонь давалі ва ўсе хаты, дзе стараліся не пераводзіць. Свойскую жывёлу падчас П. заганялі ў цёмныя лясы, на астраўкі за балоты і, парабіўшы там кашары, пасвілі статак да самае зімы. Штодня зранку і ўвечары падкурвалі гавяду тхарынаю: спадзяваліся, што такога смуроду ніякая хвароба не вытрымае. Калі надыходзіў П., сяляне ўсёй вёскай ішлі ў лес, звальвалі самую высокую хваіну, сажняў на 10, выносілі яе на сабе і ўжо ў сяле рабілі з яе найбольш значны абярэг — крыж, які ставілі на пагорку, каб адусюль яго было відаць.

*Літ.*: Сержпутовский А.К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков. СПб., 1911. С. 39—40, 139—142; Яго ж. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Мн., 1930. С. 272—273.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ